# Збароўскі школьны музей
# “Мой родны кут”.

У музеі прадстаўлена гісторыя вёсак Збароў, Вікоў, Ходасавічы, а таксама навакольных тэрыторый. Найбольш цікавыя экспанаты: кераміка эпохі неаліту і бронзы, крамянёвыя вырабы і сколы, каменная свідраваная сякера, жалезны дроцік, фрагменты шкляных бранзалетаў, манеты часу Рэчы Паспалітай і Расійскай Імперыі, гузікі, крыжыкі, успаміны Героя Савецкага Саюза К.Н. Осіпава, узнагароды Вялікай Айчынай вайны.

Экспазіцыя “Старажытная гісторыя” ахоплівае перыяд ад каменнага веку да канца 19-пачатку 20 ст. Унікальнымі для тэрыторыі Беларусі з’яўляюцца археалагічныя помнікі каля в.Ходасавічы. Асобнае месца займае гісторыя звязаная з існаваннем “Збароўскага замка” 12 ст, рэзідэнцыі рагачоўскіх князёў.












Экспазіцыя прысвечаная Вялікай Айчынай вайне дэманструе дакументы, якія належылі землякам абаронцам Айчыны, партызанам, лісты франтавікоў, лічбы ахвяр па вёсках Збароў, Вікоў, Ходасавічы, экспанаты непасрэдна з месц баявых дзеянняў.





Асобная экспазіцыя прадстаўляе аперацыю лютага 1944 у выніку якой быў вызвалены Збароўскі С/с. Экспануюцца матэрыялы і асабістыя рэчы землякоў- М.Б. Брадунова, М.Г. Царанкова, К.Н.Осіпава. З 2010 разгорнута экспазіцыя “Збароўскі рубеж 1941-га”, дзе належнае месца займае гісторыя пензенскай 61-сд.





Брадуноў М.Б. К.Н.Осіпаў








У экспазіцыі “Гісторыя савецкага перыяду 1917-1940” прадстаўлены матэрыялы пра першыя калгасы і першых калгаснікаў, тагачаснае культурнае жыццё.





Купрэеў І. Ф.

Ёсць экспазіцыя прысвечаная ўраджэнцам Збарова, якія выконвалі свой патрыятычны абавязак на зямлі Афганістана.


Зборовские ребята


ГРАМОТА

Награждается гвардии ефрейтор [illegible]

в/ч - пп 35919 за мужество и героизм, проявленные при выполнении своего воинского долга по защите южных границ Советской Родины и оказание интернациональной помощи Демократической Республике Афганистан.

КОМАНДИР ВОЙСКОВОЙ ЧАСТИ ПП 13879
гв. генерал-майор А. СЛЮСАРЬ

«28» сентября 1982 г. г. Кабул







Школа шануе памяць пра настаўнікаў-ветэранаў, якія шмат гадоў жыцця аддалі школе, ім прысвечана ганаровае месца ў нашым музеі.



У музеі праводзяцца перасоўныя выстаўкі, лекцыі, масавыя мерапрыемствы, экскурсіі.






